**14 красавіка 2017 года** на базе філіяла ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт" "Мінскі гандлёвы каледж" адбылося пасяджэнне Мінскага гарадскога метадычнага аб'яднання выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па тэме: **"Актывізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў пры вывучэнні беларускай мовы".**

Мэта: Паказаць выкарыстанне актыўных метадаў навучання і выхавання ў развіцці пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў на вучэбных занятках і ў пазавучэбнай дзейнасці па беларускай мове ў каледжы.

У пасяджэнні прынялі ўдзел *Космач Г.У.*, дырэктар філіяла; *Савіцкая Н.А.,* метадыст Мінскага гарадскога Савета кіраўнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі; *Краскоўская С.М.*, старшыня гарадскога метадычнага аб'яднання выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры; 17 прадстаўнікоў (*метадысты і выкладчыкі)* устаноў адукацыі горада, *прадстаўнікі адміністрацыі філіяла*.

Удзельнікаў пасяджэння ў фае каледжа з хлебам і соллю, з беларускімі танцамі і песнямі цёпла і сардэчна віталі навучэнцы, удзельнікі гурткоў па інтарэсах.

З прывітальным словам і прэзентацыяй філіяла перад прысутнымі выступіў *Космач Г.У.*, дырэктар філіяла. *Новаш Д.А.,* старшыня цыклавой камісіі мовазнаўства і літаратуры, праз прэзентацыю расказала пра сваіх калег-выкладчыкаў.

З уласнага вопыту пра актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў пры вывучэнні беларускай мовы з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій на занятках ў каледжы падзялілася *Смулько В.М.*, выкладчык беларускай мовы і літаратуры філіяла. А яе калега *Бондарава А.С.* расказала і паказала на прыкладах пра актывізацыю навучэнцаў праз лінгвакультуралагічны падыход.

Красамоўным і захапляльным, з творчым падыходам было выступленне навучэнцаў-удзельнікаў аб'яднання па інтарэсах "Спадчына" пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі *Дайліды А.В.*, якія запрасілі ўсіх прысутных зрабіць экскурс у гісторыю "Усё пачынаецца з яйка…".

Усе ўдзельнікі пасяджэння атрымалі з сабой на электронных носьбітах практычныя матэрыялы, якія могуць паслужыць творчым матэрыялам кожнаму выкладчыку пры рэалізацыі задач па актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў на ўроках мовы і літаратуры у сваіх навучальных установах.

Пры падвядзенні вынікаў пасяджэння за круглым сталом ўдзельнікі абмяняліся думкамі, выказалі шчырыя словы падзякі ў адрас адміністрацыі, выкладчыкаў філіяла.